

# «МЫ ПАВІННЫ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СЯБЕ ЎСІМ САМЫМ НЕАБХОДНЫМ»

**Перспектывы ўзаемадзеяння з Яраслаўскай вобласцю абмеркавалі ў Палацы Незалежнасці**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛІСТАПАДА 2025 г. АЎТОРАК № 227 (30615)

# РАСПРАЎЦЕ КРЫЛЫ І — НАПЕРАД!

**Сёлета ўпершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі адбудзецца выпуск пілотаў, падрыхтаваных Беларускай дзяржаўнай акадэміяй авіяцыі**




СТАР. 8—9

Фота Лізаветы ГОЛАД.

ЖАМЧУЖЫНЫ ЭКАТУРЫЗМУ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ 11

ЯК СПЫНІЦЬ ХВАЛЮ НЕЦЭНЗУРНАЙ ЛЕКСІКІ 13





Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25227>

9 771990 763008

ВЯРТАННЕ СПАДЧЫНЫ

## «ДАВОДЗІЦЦА КАРЫСТАЦЦА ЗВЕСТКАМІ З ГЕРАЛЬДЫКІ, ГЕНЕАЛОГІІ І НАВАТ МОДЫ»

**Як навукоўцы шукаюць культурныя каштоўнасці, вывезеныя з Беларусі нацыстамі**



Абраз з даваеннай калекцыі ДКГ БССР,1750 г. Цяпер захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Украіны (Кіеў).

У гады Вялікай Айчыннай вайны БССР страціла тысячы прадметаў мастацтва — у тым ліку сапраўдныя шэдэўры, бясцэнныя творы генія беларускага народа. За восем пасляваенных дзесяцігоддзяў вярнулася на Радзіму толькі дзясятая частка вывезеных па загадзе Гімлера з беларускіх музеяў і галерэй культурных скарбаў, адзначаюць навукоўцы. Сёння прадметы мастацтва, што некалі складалі фонды нашых музеяў, раскіданы па свеце. Іх пошукі — карпатлівая і нават у нечым дэтэктыўная праца. Пра тое, як гэта робіцца, мы спыталі ў чалавека, які прысвяціў жыццё гэтай справе, — Анатоля Сінілы, аднаго з найбольш вядомых даследчыкаў, хто займаецца ўстанаўленнем месцазнаходжання вывезеных з нашай краіны культурных скарбаў.

СТАР. 12

# «МЫ ПАВІННЫ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ СЯБЕ

## Перспектывы ўзаемадзеяння з Яраслаўскай вобласцю

Рабочы тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пачаўся сустрэчай з дэлегацыяй Яраслаўскай вобласці на чале з губернатарам Міхаілам Яўраевым. На парадку дня — прамысловая кааперацыя, пастаўка тэхнікі, новыя сумесныя праекты, у цэлым пашырэнне і паглыбленне супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі.

### «ЗАДАЧА — ДАБІЦЦА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ, ТЭХНАЛАГІЧНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ Ў НАШЫХ КРАІНАХ»

«Яраслаўская вобласць як ніякая іншая блізкая нам і родная вобласць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы даўно з вамі супрацоўнічаем, яшчэ з даўніх савецкіх часоў. Шмат што для свайго аўтамабілебудавання набываем у вас: і камплектуючыя, і тое, што называецца сэрцам любога аўтамабіля. Гатовы і далей супрацоўнічаць з вамі, не толькі пашыраць, але і паглыбляць наша супрацоўніцтва па асноўных кірунках».

Аляксандр Лукашэнка выказаў гатоўнасць беларускага боку сумесна распрацоўваць новыя ўзоры камплектуючых, запчастак для аўтамабіляў. «Гэта вельмі важна, асабліва цяпер, калі мы паставілі перад сабой задачу дабіцца незалежнасці, тэхналагічнага суверэнітэту ў нашых краінах, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Мы павінны забяспечыць сябе ўсім самым неабходным — так, як гэта было калісьці ў нашай агульнай вялікай краіне».

Па словах беларускага лідара, сумесная работа з Яраслаўскай вобласцю над вытворчасцю камплектуючых важна яшчэ і з улікам таго, што з рынкаў Беларусі і Расіі сышлі заходнія вытворцы. «У гэтым плане вельмі сур'ёзна з яраслаўцамі рушылі наперад, — канстатаваў ён. — Спадзяюся, што хутка мы замесцім наогул самыя вялікія магутныя рухавікі, атрымаем з Яраслаўля. У цэлым калі ўзяць цану/якасць нашых тавараў, наогул усіх тавараў, то мы значна пераўзыходзім імпартныя».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што нямала размоў у плане канкурэнцыі пра якасць прадукцыі, у прыватнасці машынабудавання: маўляў, недзе нешта загарэлася і гэтак далей. «Я спрабаваў разабрацца, што ж там гарыць, з Піцера пачынаючы, — удакладніў ён. — Аказваецца, не ўсё тое гарыць, што гарыць у сродках масавай інфармацыі. Але над якасцю вельмі сур'ёзна працуем».

### «ГАНДЛЁВАЯ ФІШКА БЕЛАРУСІ — АБАВЯЗКОВАСЦЬ»

Прэзідэнт лічыць, што паўмільярда долараў — рэальны тавараабарот, якога неабходна дасягнуць Беларусі з гэтым расійскім рэгіёнам. «І мы можам яго мець, калі не апусцім рукі, а будзем імкнуцца да гэтага, — канстатаваў беларускі лідар. — Дзесьці крыху больш як на 300 мільёнаў (долараў. — **«Зв.»**) мы на сёння гандлюем. Гэта не тое. Патэнцыял у нас значна вышэйшы».

Па словах кіраўніка дзяржавы, прамысловая кааперацыя выходзіць на першае месца. «Вы ведаеце нашы магчымасці, — удакладніў ён. — Ды вы і паглядзіце, мы ж не закрываемся. Усё, што вам падыходзіць, мы гатовы абмяркоўваць і прымаць рашэнні. Ведайце: калі мы прымем рашэнне і паабяцаем, то абавязкова ўсё выканаем. Гэта такая гандлёвая фішка Беларусі — абавязковасць».

Па словах Прэзідэнта, перспектыва супрацоўніцтва бачыцца і ў пастаўках электрамабіляў, будаўніцтве дамоў з электраацяпленнем. «Дзякуй Богу, электрычнасці як у нас, так і ў вас хапае — нават у лішку, — падкрэсліў ён. — Вар'яты гэтыя адмовіліся ад электраэнергіі па лініі БРЭЛЛ (размова аб выхадзе краін Балтыі з адзінага з Беларуссю і Расіяй энергетычнага кальца БРЭЛЛ. — **«Зв.»**), сёння пакутуюць там. Але гэта іх праблемы. Няхай працуюць, яны выбралі гэты шлях. У нас ёсць лішак электрычнасці, таму будзем выкарыстоўваць электрамабілі і дамы, якія абаграваюцца электрычнасцю».

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў, што ў Беларусі ўжо пабудавалі каля двух мільёнаў «квадратаў» такіх дамоў. «Людзі вельмі задаволены, — заўважыў Прэзідэнт. — Людзі заўсёды задаволены, калі добра. Але самае галоўнае, што тыя тарыфы, адносна невысокія ў Беларусі, пакрываюць сабекошт электрычнай энергіі, якая найперш выпрацоўваецца на атамнай станцыі. Таму ў гэтым кірунку гатовы рухацца».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы прапанаваў яраслаўскай дэлегацыі падчас наведвання беларускіх прадпрыемстваў звярнуць увагу на нашу тэхніку не толькі на газаматорным паліве, якую мы вырабляем у дастатковай колькасці, але і на электрычнай цязе. Па яго словах, гэта таксама вельмі добры кірунак супрацоўніцтва.

**Даслоўна**

### «Важна, каб супрацоўніцтва было выгадным, выбудаваным на эканоміцы, на рэаліях»

У Беларусі і Яраслаўскай вобласці вельмі добрыя перспектывы для далейшага развіцця. Аб гэтым у размове з журналістамі па выніках сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы заявіў **губернатар Яраслаўскай вобласці Міхаіл Яўраеў.**

«Аляксандр Рыгоравіч адзначыў, што ў нас ёсць далейшыя магчымасці для развіцця. І гэта сапраўды так. Мы бачым, што ў нас наладжваецца добрае супрацоўніцтва ў прамысловым і аграпрамысловым сектары», — сказаў Міхаіл Яўраеў.

Губернатар Яраслаўскай вобласці паведаміў, што сёння каля 140 беларускіх аўтобусаў курсіруюць па расійскім рэгіёне. «У снежні плануецца пастаўка яшчэ 100 беларускіх аўтобусаў. Важна, што яны на нашых яраслаўскіх рухавіках. Тут у нас атрымліваецца добрае ўзаемнае тэхнічнае супрацоўніцтва: і па лакафарбавай прадукцыі, і па запчастках... Мы зацікаўлены і ў электратранспарце. Гэта значыць, кірункаў сапраўды шмат», — канкрэтызаваў Міхаіл Яўраеў. Ён дадаў, што беларускія аўтобусы з яраслаўскімі рухавікамі пастаўляюць і ў іншыя рэгіёны Расіі.

Кажучы аб супрацоўніцтве паміж ВНУ, губернатар праінфармаваў, што ў 13 ВНУ Яраслаўскай вобласці наладжана цеснае ўзаемадзеянне з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Беларусі. Па яго словах, ёсць перспектывы і ў сферы турызму. «Мы б хацелі, каб на яраслаўскім тэлебачанні расказвалі пра Рэспубліку Беларусь, каб нашы жыхары прыязджалі сюды адпачываць і каб тут, на беларускім тэлебачанні, расказвалі пра Яраслаўскую вобласць. Каб была магчымасць узаемнага турыстычнага абмену», — адзначыў губернатар.

Цяперашні візіт у Беларусь губернатар Яраслаўскай вобласці назваў яшчэ адным сур'ёзным крокам у напрамку ўзаемнага супрацоўніцтва паміж нашымі брацкімі народамі. «Важна, каб супрацоўніцтва было выгадным, выбудаваным на эканоміцы, на рэаліях. Вельмі многае цяпер залежыць ад нашай тэхналагічнай незалежнасці. Мне здаецца, ужо ва ўсім свеце зразумелі, што тэхналагічная незалежнасць мае вялікае значэнне, таму мы развіваем тэхналогіі, узаемна ўзбагачаем адзін аднаго, рухаемся наперад. Усё гэта вядзе да павышэння ўзроўню жыцця нашых грамадзян. Гэта галоўная мэта», — падагульніў кіраўнік дэлегацыі.



# «ДЗЯРЖАВА МАЕ ПРАВА ПАТРАБАВАЦЬ

## Эксперты — пра ролю вучоных

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*«Хачу ў вас спытаць пра статус вучонага. Вы ад мяне хочаце, каб я ваш статус павысіў? Вы задумайцеся, як я, над гэтым. Я ўвесь тыдзень думаю, як мне ваш статус павысіць. Ніхто, акрамя самога вучонага, статус павысіць не можа. Гэта павінны зрабіць вы. Гэта не толькі да мяне пытанне, але і да вас — статус вучонага. Запомніце: не павысіце яго — ніякага ў вас статусу не будзе. Статус — не заробак і грошы. Гэта ваш узровень як вучонага. Таму статус вучонага шукайце ў сабе».*

***На нарадзе па пытаннях развіцця навуковай сферы і дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, 21 лістапада 2025 г.***

Навукова-тэхнічны прагрэс, наступленне чацвёртай прамысловай рэвалюцыі непазбежна пацягнулі за сабой шматразовае ўзмацненне ролі акадэмічнай, вузаўскай, галіновай навукі і ўкладу навуковай грамадскасці ў сацыяльна-эканамічнае развіццё грамадства. Беларусь не з'яўляецца выключэннем. Сёння для канкурэнтаздольнасці ў сусветнай прасторы неабходна распрацоўка сур'ёзных інавацыйных праектаў і практычнае інтэграванне іх у рэальны сектар эканомікі. Гэтым пытанням і была прысвечана нарада кіраўніка дзяржавы з навуковай грамадскасцю, якая адбылася ў мінулую пятніцу, выклікаўшы рэзананс у экспертаў, якія самі маюць дачыненне да навуковай супольнасці. Найбольш яркія меркаванні — у нашым матэрыяле.

# ЎСІМ САМЫМ НЕАБХОДНЫМ»

## абмеркавалі ў Палацы Незалежнасці



### «ГЭТА ВЕЛЬМІ ДОБРЫЯ ЛІЧБЫ, ЯКІЯ СВЕДЧАЦЬ АБ ТЫМ, ШТО МЫ ЎЗАЕМНА РАЗВІВАЕМСЯ»

У сваю чаргу, губернатар Яраслаўскай вобласці Міхаіл Яўраеў падзякаваў кіраўніку дзяржавы за сустрэчу і падкрэсліў, што дэлегацыя Яраслаўскай вобласці адчувае сябе ў Беларусі як дома. «Мы сапраўды адчуваем, што знаходзімся дома. І мы прыехалі вялікай дэлегацыяй. У яе склад уваходзяць прадстаўнікі больш як 10 прадпрыемстваў. Да гэтага візіту мы ставімся вельмі сур'ёзна», — адзначыў ён.

Міхаіл Яўраеў падкрэсліў, што паміж Беларуссю і Яраслаўскай вобласцю ёсць добрыя перспектывы для далейшага супрацоўніцтва, кірункаў для ўзаемадзеяння сапраўды шмат. Па яго словах, узаемадзеянне паміж нашай краінай і расійскім рэгіёнам наладжана.

«Узаемны тавараабарот паміж Беларуссю і Яраслаўскай вобласцю сёння складае каля 300 мільёнаў долараў, і пры гэтым ён расце, — дадаў губернатар. — За папярэдні каляндарны год ён вырас больш чым на 18 %. Гэта вельмі добрыя лічбы, якія сведчаць аб тым, што мы ўзаемна развіваемся».

Для Яраслаўскай вобласці, паводле слоў кіраўніка рэгіёна, вельмі важна супрацоўніцтва і ў прамысловасці, і ў аграпрамысловай сферы, і ў сферы турызму. «У дадзеным выпадку магу сказаць, што культура і спорт — гэта сферы, дзе нашы калектывы ўзаемна ўзбагачаюцца», — сказаў Міхаіл Яўраеў. Ён звярнуў увагу на высокі ўзровень беларускіх фрыстайлістаў на спаборніцтвах, што праводзіліся сёлета ў Яраслаўскай вобласці.

**Вераніка КАНЮТА, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

### «ЁСЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА»

Што датычыцца ўзаемадзеяння ў галіне сельскай гаспадаркі, Прэзідэнт канстатаваў, што ў Яраслаўскай вобласці гэта сфера даволі развітая. «Але, калі нешта вам спадабаецца ў Беларусі (а кліматычныя ўмовы ў нас прыкладна аднолькавыя), мы гатовы і свінаводства, і племянную справу, і селекцыйныя пытанні таксама з вамі развіваць і прасоўваць», — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ніякіх праблем у Беларусі і Яраслаўскай вобласці, па словах Прэзідэнта, няма і ў гуманітарнай сферы. «Для нас вельмі важна, што паважаны ў нас, у Беларусі, Максім Багдановіч вучыўся ў вас, — нагадаў ён. — Валянціна Церашкова мае беларускія карані. Гэта таксама звязвае ваш рэгіён з нашай краінай».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на поспехі яраслаўскіх спартсменаў. У прыватнасці, вялася размова аб хакейнай камандзе «Лакаматыў», якая летась выйграла чэмпіянат Кантынентальнай хакейнай лігі, а сёлета заваявала Кубак Гагарына.

«Лічу, што гэта вельмі моцны чэмпіянат, калі ў сусветным маштабе браць, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Нічым НХЛ ён практычна не саступае, сёлета яшчэ больш моцным стаў. Я задаволены пакуль, як іграюць і мінскія «дынамаўцы», але ёсць да чаго імкнуцца, гледзячы на ваш «Лакаматыў». Вы вялікія малайцы. Усё-такі «Дынама-Мінск» — гэта каманда краіны, рэспубліканская каманда. А вы ў барацьбе з рэгіёнамі Расіі змаглі аснасціць сваю каманду, хакейную ў дадзеным выпадку, і паказаць, што такое Яраслаўль. Прыгажуны, вельмі мне падабаецца ваша каманда. Многае мы ў вас пераймаем. Ёсць чаму павучыцца».

Па словах беларускага лідара, у цэлым зімнія віды спорту ў Яраслаўлі вельмі любяць. «Гэта я ведаю яшчэ са сваёй прэзідэнцкай маладосці, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Яраслаўль яшчэ не толькі ў хакеі сябе пакажа. Хутка яны і ў футболе паб'юць нас так, што сорамна будзе потым казаць. Таму ёсць чаму вучыцца».

Працягваючы тэму супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы, Аляксандр Лукашэнка дадаў, што ніякіх пытанняў з гэтым рэгіёнам Расіі ў нас няма і ў галіне адукацыі, па лініі культурных кантактаў.

«Словам, вы для нас родныя людзі, — рэзюмаваў ён. — Мы гатовы з вамі супрацоўнічаць па ўсіх кірунках. Ведайце, што вы не за мяжу прыехалі. Мы таксама Яраслаўскую вобласць і ўсю Расію не разглядаем як чужую. Яраслаўская вобласць не з'яўляецца для нас ніякім замежжам. Мы вельмі задаволены супрацоўніцтвам».

Прэзідэнт канстатаваў, што мінчане сталі часцей ездзіць у Маскву і наадварот — масквічы ў Мінск. У сувязі з гэтым паўстае пытанне аб дадатковых авіярэйсах і чыгуначных саставах. Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб дамоўленасці з Уладзімірам Пуціным пабудаваць высокамагутную магістраль, якая злучыць дзве сталіцы. «Каб нашым людзям жылося лепш і каб яны разумелі, што лепшага за нашу зямлю нідзе нічога няма», — падагульніў беларускі лідар.

## У тэму

### Прамкааперацыя, сельгастэхніка і станкабудаванне



**Беларусь зацікаўлена ў пастаўках у Яраслаўскую вобласць розных відаў тэхнікі і ліфтаў. Аб гэтым заявіў намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Віктар Каранкевіч падчас сустрэчы з губернатарам Яраслаўскай вобласці Міхаілам Яўраевым.**

«Беларусь разглядае Яраслаўскую вобласць як надзейнага гандлёва-эканамічнага партнёра. За апошнія пяць гадоў узаемны тавараабарот вырас у 1,7 раза і па выніках 2024 года дасягнуў рэкорднага значэння 370 мільёнаў долараў. Гэты вынік стаў магчымым у тым ліку дзякуючы рэалізацыі праграмы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва паміж урадамі Беларусі і Яраслаўскай вобласці на 2024—2025 гады. Для захавання такой станоўчай тэндэнцыі неабходна прадоўжыць ствараць спрыяльныя ўмовы для пашырэння ўзаемадзеяння, тым больш што патэнцыял для гэтага далёка не вычарпаны», — адзначыў Віктар Каранкевіч.

Адным з ключавых кірункаў ён назваў прамысловасць і вытворчую кааперацыю. «Паміж беларускімі і яраслаўскімі вытворцамі ўстаноўлены трывалыя доўгатэрміновыя сувязі. У якасці прыкладу можна прывесці сумесную работу ААТ «БАТЭ» і Барысаўскага завода агрэгатаў з ПАТ «Аўтадызель», «Гомсельмаша» з Тутаеўскім маторным заводам, БМЗ з «Кардыянтам». У ходзе сустрэчы хацелася б дэталёва абмеркаваць магчымыя аспекты, якія датычацца парка абнаўлення пасажырскай тэхнікі Яраслаўскай вобласці за кошт сучасных мадэляў, якія выпускаюцца беларускімі заводамі», — зазначыў віцэ-прэм'ер.

Акрамя таго, наша краіна зацікаўлена ў пашырэнні супрацоўніцтва ў частцы паставак сельскагаспадарчай і грузавой тэхнікі, дарожна-будаўнічых машын, ліфтавага абсталявання. Віктар Каранкевіч таксама акцэнтаваў увагу на станкабудаванні: беларускія станкабудаўнічыя заводы маюць вопыт паспяховай работы ў Яраслаўскай вобласці і зацікаўлены ў прадаўжэнні ўдзелу ў тэхнічным пераўзбраенні прамысловых прадпрыемстваў расійскага рэгіёна праз пастаўку, мадэрнізацыю і абслугоўванне высокатэхналагічных станкоў.

У галіне сельскай гаспадаркі ў Беларусі ёсць сучасныя напрацоўкі навукова-практычных цэнтраў у сферах раслінаводства і жывёлагадоўлі, механізацыі сельскай гаспадаркі, якімі беларускі бок гатовы падзяліцца з аграпрамысловымі прадпрыемствамі Яраслаўшчыны. Беларусь таксама гатова прэзентаваць праекты малочнатаварных ферм — абсталявання і тэхналогій. У краіны ёсць вопыт паставак тэхнікі для меліярацыйных работ.

**Паводле БелТА.**

# ПРАРЫЎНЫХ РАСПРАЦОВАК»

## у развіцці краіны

### Ліквідаваць у максімальна кароткія тэрміны!

#### Уладзімір Каранік — аб тым, што перашкаджае імпартазамяшчэнню



**Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір КАРАНІК** у эфіры тэлеканала АНТ расказаў, на што ў першую чаргу трэба звярнуць увагу і што ліквідаваць пры імпартазамяшчэнні, паведамляе БелТА.

Як было адзначана ў эфіры, вялікая ўцягнутасць у праекты рэальнага сектара эканомікі і работа на вынік — асноўныя патрабаванні Прэзідэнта да навуковай супольнасці. Каб навука стала рэальным драйверам развіцця краіны, задачы кіраўнік дзяржавы паставіў на вялікай нарадзе ў канцы мінулага тыдня. Сёння пасылы дэталёва абмяркоўваюць у навуковых калектывах.

Так, на сустрэчы з актывам Нацыянальнай акадэміі навук старшыня яе Прэзідыума спыніўся на прыярытэтных кірунках. Акцэнт быў зроблены на тым, што распрацоўкі навукоўцаў неабходныя ў вытворчасці, асабліва ў сферы машынабудавання, сельскай гаспадаркі, медыцыны і сувязі. Даручана падрыхтаваць навукова-тэхнічныя парады з дзяржрэгулятарамі, таксама будзе рэвізія ўсіх сумесных праектаў.

— Што датычыцца інфарматызацыі Міністэрства аховы здароўя, дзе мае значэнне дапрацоўка Аб'яднаным інстытутам праблем інфарматыкі сваіх праграмных прадуктаў, якія выкарыстоўваюцца практычнай аховай здароўя, — гэта цесная работа з Мінсельгасхарчам па, зноў жа, падрыхтоўцы тэхнікі, павышэнні надзейнасці нашай сельскагаспадарчай тэхнікі, — расказаў кіраўнік НАН.

Уладзімір Каранік зрабіў акцэнт:

— Я шчыра не разумею, чаму, маючы каласальны досвед работы з металамі, умацавання металаў, мы досыць простыя камплектуючыя і працоўныя органы закупляем за мяжой. І вось тут, напэўна, гэта якраз няведанне праблем адных і дасягненняў іншых. Гэта трэба ў рамках імпартазамяшчэння ліквідаваць у максімальна кароткія тэрміны.

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук падкрэсліў:

— Кіраўніком дзяржавы было пастаўлена жорсткае патрабаванне, (якое датычыцца. — **«Зв.»**) Аб'яднанага інстытута машынабудавання, — гэта работа па павышэнні надзейнасці нашай тэхнікі. І тут напрацовак, кампетэнцый таксама хапае.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

АКЦЭНТЫ

# ДЗЕЙНІЧАЦЬ У КАНСТРУКТЫЎНЫМ КЛЮЧЫ

## Беларусь заўсёды адкрыта да дыялогу са сваімі суседзямі



Пра гэта заявіў Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН у эфіры тэлеканала «Беларусь 1», каментуючы імпульсіўныя дзеянні суседзяў на граніцы.

— Самае галоўнае, што з суседзямі трэба заўсёды размаўляць, перш чым прымаць нейкія рашэнні. Усё ж такі мы павінны заўсёды дзейнічаць у канструктыўным ключы, зыходзячы з інтарэсаў нашых грамадзян, эканомік, бізнесу, — сказаў Аляксандр Турчын.

Паводле яго слоў, пры наяўнасці праблем у міждзяржаўных адносінах Беларусь заўсёды адкрыта да дыялогу.

— Давайце будзем абмяркоўваць, вырашаць праблемы. А гэтыя ўсе імпульсіўныя дзеянні (закрыццё граніц. — **Заўв. рэд.**) не вельмі пасуюць да людзей такога высокага ўзроўню, — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада.

**Міністр замежных спраў Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ** у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» растлумачыў, чаму Польшча перайшла ад канфрантацыі да дыялогу па пытаннях супрацоўніцтва на граніцы.

Са слоў міністра, Польшча прадэманстравала Літве «жорсткі, нармальны прагматызм».



— Польшча лепш лічыць грошы, і Польшча рэальна хоча быць прадказальным партнёрам у выбудоўванні вельмі сур'ёзнага хаба на сваёй тэрыторыі — лагістычнага, транспартнага, да чаго яны і імкнуцца, — сказаў Максім Рыжанкоў.

Ён адзначыў, што мэтай ранейшай канфрантацыі на граніцы з Беларуссю было прыцягненне залішняй увагі з боку Еўрапейскага саюза, НАТА і асноўных партнёраў па гэтых арганізацыях для атрымання сур'ёзных фінансавых укладанняў — нібыта на прадухіленне пагрозы з усходу.

— Сёння пастановы прынятыя, грошы пачынаюць паступаць, асвойвацца, і Польшча цяпер паволі можа ад канфрантацыі адыходзіць да выбудоўвання дыялогу ў іншай плоскасці. Гэта вельмі прагматычныя людзі, — падкрэсліў кіраўнік МЗС.

**Па матэрыялах БелТА.**

# ПЕРАГАВОРЫ З ЗША І ГУЧНЫЯ ПАМІЛАВАННІ

## Прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля ЭЙСМАНТ у суботу пракаментавала рэзанансную інфармацыю з прэзідэнцкай павесткі



Перагаворы Беларусі з рознымі краінамі, і перш за ўсё з ЗША, знаходзяцца ў актыўнай фазе, заявіла прэс-сакратар Прэзідэнта. «Хачу падкрэсліць: наш Прэзідэнт паступальна выступае за стабілізацыю сітуацыі ў рэгіёне, наладжванне дыялогу паміж усімі дзяржавамі і вырашэнне ўсіх спрэчных пытанняў выключна мірным шляхам», — заявіла Наталля Эйсмант. «Мы заўсёды гаварылі і гаворым: Рэспубліка Беларусь адкрыта да дыялогу і гатова разглядаць прапановы ўсіх зацікаўленых бакоў», — сказала яна.

«У развіццё дасягнутых дамоўленасцяў паміж Прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам і Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам па просьбе ўкраінскага боку ў мэтах стварэння ўмоў для ўрэгулявання ўзброенага канфлікту ў сумежнай дзяржаве, кіруючыся прынцыпамі гуманізму і ў якасці жэсту добрай волі, Прэзідэнтам памілаваны 31 грамадзянін Украіны, які здзейсніў крымінальныя злачынствы на тэрыторыі нашай краіны», — заявіла Наталля Эйсмант.

Яна таксама пракаментавала памілаванне Прэзідэнтам Беларусі двух каталіцкіх святароў. «Сапраўды, кіраўніком дзяржавы 20 лістапада памілаваны два каталіцкія святары — Анджэй Юхневіч і Генрых Акалатовіч, асуджаныя за ўчыненне цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў супраць дзяржавы, а таксама іншыя злачынствы, — сказала прэс-сакратар. — Гэта рашэнне было прынята па просьбе Папы Рымскага Льва XIV пры ўдзеле мітрапаліта Іосіфа Станеўскага ў рамках жэста добрай волі, кіруючыся прынцыпамі міласэрнасці і гуманізму, улічваючы стан здароўя асуджаных, а таксама ў мэтах развіцця адносін Рэспублікі Беларусь са Святым Прастолам».

**Паводле БелТА.**

# «ДЗЯРЖАВА МАЕ ПРАВА ПАТРАБАВАЦЬ ПРАРЫЎНЫХ РАСПРАЦОВАК»

## КРАІНА ЗАЎСЁДЫ ГАТОВА ПАДСТАВІЦЬ ПЛЯЧО



На думку **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, кандыдата юрыдычных навук Сяргея СІЎЦА**, цяперашні ўдзел Акадэміі навук ва ўдасканаленні прамысловага патэнцыялу краіны, рэальнага сектара эканомікі недастатковы. Так, з 98 інавацыйных праектаў, якія сёння рэалізоўваюцца, толькі дзевяць адносяцца да Нацыянальнай акадэміі навук, прычым толькі шэсць з іх фактычна завершаны дасягненнем канкрэтнага выніку. Гэта вельмі нізкі паказчык удзелу акадэмічных інстытутаў у мадэрнізацыі, навуковым пераўзбраенні рэальнага сектара эканомікі.

— Вядома, такое становішча спраў не можа задавальняць. Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на болевых кропках, звязаных з тым, што, як правіла, навуковыя даследаванні не завяршаюцца ўкараненнем доследных, эксперыментальных узораў у серыйную вытворчасць, — акцэнтаваў увагу ў гутарцы з БелТА сенатар.

Сяргей Сівец адзначыў вельмі слабую кааперацыю акадэмічных інстытутаў з прамысловым сектарам эканомікі. На гэта паўплываў шэраг аб'ектыўных прычын і перадумоў, звязаных як з арганізацыйнай структурай Акадэміі навук, так і амаладжэннем кадраў, пераемнасцю пакаленняў у навуцы, недастатковай падрыхтоўкай дысертацыйных даследаванняў і абаронай у тэрмін доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. Дастаткова сур'ёзны комплекс праблем патрабуе сістэмнага падыходу.

— Кіраўнік дзяржавы ў цэлым падтрымаў прапановы, з якімі выступіла кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук, даручыў ураду больш глыбока, падрабязна іх прапрацаваць. Яшчэ раз пазначыў, што дзяржава заўсёды гатова падставіць плячо і дапамагчы вучоным у рэалізацыі новых ідэй, інавацый, прапаноў, ініцыятыў, у прасоўванні навуковых праектаў, але толькі калі ёсць вынік, — адзначыў член Савета Рэспублікі.

Так, дзяржава гатова фінансаваць любы інавацыйна прарыўны кірунак ці праект, але з гарантаваным атрыманнем выніку. Размовы аб рэалізацыі амбіцыйных навуковых ідэй без практычнага выніку, без карысці для эканомікі краіны і для беларускага грамадства сёння непрымальныя.

— Даследаванні дзеля даследаванняў — не той алгарытм, які сёння будзе задавальняць краіну, — упэўнены Сяргей Сівец.

*(Заканчэнне. Пачатак на 2–3-й стар.)*

## НАВУКОВЫЯ ШКОЛЫ ТРЭБА ФАРМІРАВАЦЬ ТАМ, ДЗЕ ЁСЦЬ ЗНАЧНЫЯ НАПРАЦОЎКІ



У навукоўцаў павінна быць дакладнае разуменне, што патрэбен канкрэтны вынік іх дзейнасці, лічыць **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры, доктар гістарычных навук Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ**.

— Асабліва гэта датычыцца сфер навукі, звязаных з эканамічным развіццём, з сельскай гаспадаркай, з прамысловасцю. Беларусь, на жаль, не мае вялізных запасаў карысных выкапняў, якія можна прадаваць, атрымліваць за іх шалёныя грошы, якія можна ўкладваць у развіццё дзяржавы і грамадства, — заўважыў ён. —Ключавым багаццем нашай краіны з'яўляецца інтэлект. Менавіта ад навукі кіраўнік дзяржавы і наша грамадства ў цэлым чакае практычнага ўкладу ў далейшае паспяховае развіццё нашай краіны».

Звярнуў увагу дэпутат і на словы Прэзідэнта аб тым, што праца навукоўцаў павінна ацэньвацца годна, але па выніку.

– Як слушна заўважыў кіраўнік дзяржавы, не трэба гнацца за колькасцю нашай навуковай супольнасці, важная яе якасць, яна стаіць на першым месцы. Навуковыя школы важна фарміраваць у тых кірунках, у якіх у нас ужо ёсць значныя напрацоўкі, яўныя магчымасці атрымаць высокія вынікі для эканомікі, для прамысловасці, для сельскай гаспадаркі, для іншых сфер жыццядзейнасці нашага грамадства, — лічыць парламентарый.

## АЦЭНКА ТАКАЯ, ЯК ЁСЦЬ



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ** акцэнтаваў увагу на тым, што Прэзідэнт прапанаваў аб'ектыўную формулу поспеху для айчыннай навукі: павышэнне статусу вучонага прама прапарцыянальна залежыць ад яго асабістага ўкладу ў навуковую распрацоўку і ступені практычнага ўкаранення навуковай ідэі ў рэальны сектар эканомікі Рэспублікі Беларусь.

**Эканамічны аналітык, кандыдат эканамічных навук Георгій ГРЫЦ** у эфіры «Першага інфармацыйнага» дапоўніў:



— Трэба разумець, што такое навука, і рабіць градацыю. Ёсць акадэмічная навука, фундаментальная, і галіновая навука. Гэта дзве розныя рэчы і два розныя псіхатыпы навукоўцаў, вынаходнікаў.

Эксперт пагаджаецца: у акадэмічнай навуцы ёсць прабелы. Міжнародныя інстытуты ацэньваюць фундаментальную беларускую навуку па двух крытэрыях: колькасць патэнтаў (патэнты — гэта міжнароднае пацвярджэнне статусу) і колькасць артыкулаў, якія пішуць навукоўцы ў часопісах, што рэцэнзуюцца. Лідары ў гэтым рэйтынгу традыцыйныя — Кітай і Злучаныя Штаты Амерыкі. І першы, і другі крытэрый адрозніваюцца ў сотні разоў.

— Таму тут крыўдзіцца няма на каго. Няма чаго крыўдзіцца на кіраўніка дзяржавы. Ацэнка такая, як ёсць, — сказаў ён.

Гаворачы аб прыкладной навуцы, Георгій Грыц адзначыў высокі статус Акадэміі навук, які самі ж навукоўцы і папрасілі.

— Акадэмія навук знаходзіцца ў асабістым падначаленні кіраўніку дзяржавы і дае справаздачу толькі перад урадам. Фактычна статус роўны Нацыянальнаму банку, іншым інстытутам, Камітэту дзяржкантролю і гэтак далей. Таму гэты высокі статус, які самі сабе навукоўцы папрасілі, на жаль, сёння трошкі іх буксуе, — лічыць эканамічны аналітык.

## ПРАДСТАЎЛЯЦЬ НЕ ТОЛЬКІ СЯБЕ, АЛЕ І НАВУКОВУЮ ШКОЛУ



**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў, член-карэспандэнт НАН, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК** лічыць, што адна з самых актуальных задач навуковай супольнасці, аб якіх гаварыў Прэзідэнт, — вырашэнне пытання кадравай пераемнасці.

– Кожны навуковец, калі сапраўды рэалізаваў сябе як вучоны, як доктар навук, павінен падрыхтаваць сабе годную змену, сам быць прызнаным аўтарытэтам навуковай школы, — заўважыў парламентарый. — Гэта адзін з найважнейшых элементаў для нармальнага развіцця навукі.

Асабліва, на думку Ігара Марзалюка, гэта датычыцца тых навукоўцаў, якія прэтэндуюць на званне членкара Акадэміі навук, а тым больш акадэміка:

– Яны павінны прадстаўляць не толькі саміх сябе, але і навуковую школу.

БЕЛАРУСЬ БУДУЧЫНІ

# ПЕРАХОД ДА НОВАЙ ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ ГРАМАДЗЯН

**Праект Праграмы сацыяльна-экамічнага развіцця да 2030 года разгледзелі ў Савеце Рэспублікі**

## КАМФОРТ, ТЭХНАЛОГІІ І МОЦНЫЯ РЭГІЁНЫ

Новая праграма абяцае стаць дакументам сучаснасці, без аглядкі на мінулыя фармулёўкі. Аб канкрэтных кроках для дасягнення мэт, задачах і прынцыпах праекта сенатарам расказаў **міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь Юрый ЧАБАТАР.**

Новая пяцігодка, паводле слоў міністра, павінна быць зразумелай для ўсіх, адлюстроўваць усе запыты грамадства. Таму задачы, на якіх павінна канцэнтравацца дзяржава для дасягнення галоўнай мэты — новай якасці жыцця беларусаў, — дакумент выкладае сучасна, выразна і коратка. Дзеля гэтай жа мэты ён структураваны вакол сямі ключавых прыярытэтаў: нацыянальная дэмаграфічная бяспека — захаванне насельніцтва, умацаванне здароўя нацыі і падтрымка сям'і; развіццё чалавечага патэнцыялу, якасная адукацыя, выхаванне гарманічнай і патрыятычнай асобы; стварэнне якаснага і зручнага асяроддзя для жыцця; рост канкурэнтаздольнасці, паскарэнне тэхналагічнага развіцця і лічбавая трансфармацыя; моцныя рэгіёны; умацаванне абараназдольнасці дзяржавы і развіццё абароннага сектара эканомікі; рэалізацыя турыстычнага патэнцыялу.



Рэалізоўвацца праграма будзе праз сістэму з 20 дзяржаўных праграм, якія з'яўляюцца ключавым інструментам бюджэтнага фінансавання, 17 галіновых — для прыцягнення камерцыйных інвестыцый, а таксама 7 рэгіянальных і 38 навуковых праграм. «Такім чынам, праграма становіцца канкрэтнай, кампактнай, народнай, а гэта значыць зразумелай і даступнай кожнаму грамадзяніну», — адзначыў міністр эканомікі.

Сярод прыярытэтаў праграмы — дэмаграфія і ахова здароўя, тэмы паміж сабой узаемазвязаныя. Ахоп дыспансерызацыяй дарослага насельніцтва, паводле слоў міністра эканомікі, павінен будзе дасягнуць узроўню не менш як 95 %. Не застанецца без увагі і інфраструктура: праект праграмы абяцае пашырыць шматфункцыянальную сетку ўстаноў дашкольнай адукацыі, зрабіць яе яшчэ больш даступнай. У кожнай вобласці краіны ў наступныя пяць гадоў плануецца забяспечыць работу не менш як трох міжраённых цэнтраў спецыялізаванай медадапамогі.

У сацыяльнай сферы акцэнт у будучую пяцігодку плануюць зрабіць і на клопаце аб маладым пакаленні: у праекце праграмы з'явіўся цэлы раздзел, прысвечаны моладзі. Дарэчы, плануецца, што не менш як 15 % месцаў у органах дзяржаўнага кіравання і самакіравання зоймуць менавіта маладыя людзі.

За пяць гадоў доля высокатэхналагічных вытворчасцяў павінна будзе павялічыцца да 8,5 %, а гадавы аб'ём вытворчасці электрамабіляў — складаць не менш як 10 тысяч адзінак, што павялічыць запыт на айчынную прадукцыю, у тым ліку і за мяжой.

Ключавое адрозненне новай праграмы — яе ўзгадненне з рэгіянальнымі. Запланавана будаўніцтва новых прадпрыемстваў, аб'ектаў сацыяльнай сферы, арэнднага жылля. «Асаблівая ўвага будзе ўдзелена забеспячэнню транспартнай даступнасці. У прыватнасці, імкнёмся да таго, каб час у дарозе да гарадоў-спадарожнікаў не перавышаў 20—30 хвілін», — адзначыў міністр эканомікі.

## «ПРАГРАМА ЗРАЗУМЕЛАЯ І ДАКЛАДНА СТРУКТУРАВАНАЯ ПА МЕХАНІЗМАХ РЭАЛІЗАЦЫІ»

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Уладзіслаў ТАТАРЫНОВІЧ** у размове з журналістамі адзначыў, што члены Савета Рэспублікі былі ўключаны ў склад міжведамаснай рабочай групы па падрыхтоўцы праекта, удзельнічалі ў распрацоўцы канцэпцыі, якую адобрыў кіраўнік дзяржавы. Абмеркаванне насіла «прыкладны, прадметны характар». Асаблівая ўвага да таго, як задачы, якія вызначаны, будуць рэалізоўвацца ў рэгіёнах, на месцах.



«Галоўнае, што хочацца падкрэсліць: праграма арыентавана на пераход да новай якасці жыцця грамадзян. Сем прыярытэтаў будуць закранаць усе сферы нашай жыццядзейнасці. У першую чаргу гэта пытанні сацыяльнага блока, дэмаграфічны патэнцыял, развіццё чалавечага патэнцыялу, пытанні, звязаныя са стварэннем камфортных умоў для жыцця», — сказаў Уладзіслаў Татарыновіч.

Ён звярнуў увагу на тое, што праграма зразумелая і дакладна структураваная па механізмах рэалізацыі. За кожны кірунак адказвае канкрэтны міністр, рэгіёны. Уся работа выбудавана так, каб задачы былі дасягальныя, збалансаваныя па рэсурсах і выканаўцах.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі Віктар АНАНІЧ** дадаў, што ад удзельнікаў пасяджэння паступіла дастаткова шмат пытанняў. Абазначаны асноўныя кірункі развіцця краіны, на якіх будзе зроблены акцэнт. Ключавое адрозненне новай праграмы — яе ўзгадненне з рэгіянальнымі праграмамі. У мінулым пяцігоддзі дакументы прымаліся асобна. Запланавана будаўніцтва новых прадпрыемстваў, аб'ектаў сацыяльнай сферы, арэнднага жылля. Для фінансавання рэгіянальных ініцыятыў сфарміраваны спецыяльныя праграмы, будуць выдзяляцца банкаўскія крэдыты на льготных умовах.



Асаблівая ўвага — развіццю турызму. «У нас багатая прырода, ёсць патэнцыял для развіцця як унутранага, так і ўязнога турызму», — сказаў Віктар Ананіч.

**Аміна НАЗАРАВА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# БЮДЖЭТ, ПАДАТКІ, ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ, НАТАРЫЯЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

**У Палаце прадстаўнікоў разгледзелі пакет бюджэтных законапраектаў на 2026 год**

Усяго 9 праектаў законаў прынялі дэпутаты 24 лістапада на пасяджэнні трэцяй сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

***У першым чытанні прыняты законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2026 год».*** Праект рэспубліканскага бюджэту і разліковыя паказчыкі па бюджэтах абласцей і сталіцы на 2026 год распрацаваны на аснове палажэнняў праграмных дакументаў па сацыяльна-эканамічным развіцці краіны з улікам існуючай эканамічнай сітуацыі. Для сектара дзяржаўных фінансаў ключавой задачай у наступным годзе будзе забеспячэнне эканамічнага росту для ўмацавання дзеючых сацыяльных гарантый і скарачэння рэгіянальных дыспрапорцый.



Як праінфармаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Васіль ПАНАСЮК**, галоўны фінансавы дакумент будучага года ўзаемазвязаны перш за ўсё з параметрамі сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны ў 2026 годзе: «Прыемна адзначыць, што з папярэднімі будзе як даходная, так і расходная частка. Адпаведна, даходная частка павялічыцца на 14 %, расходная — на 10 %. У структуры расходнай часткі ў абавязковым парадку прадугледжана павелічэнне расходаў на сацыяльную сферу — гэта ахова здароўя, адукацыя. Перш за ўсё расходная частка ў бюджэце прадугледжана павелічэннем расходаў на падтрымку прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі, на абслугоўванне знешняга доўгу, на дадатковыя і сацыяльныя выплаты, такія як сямейны капітал, будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай. Значнае асігнаванне прадугледжана на будаўніцтва і выкананне мерапрыемстваў па дзяржаўнай інвестпраграме», — адзначыў Васіль Панасюк.

***У двух чытаннях прыняты праект закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2026 год».*** Ён вызначае крыніцы фарміравання даходаў, іх аб'ём і кірункі выкарыстання сродкаў. Даходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 39 014,4 мільёна рублёў, або 110,8 % да бюджэту фонду за 2025 год. Асноўную долю ў структуры ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне складаюць абавязковыя страхавыя ўзносы працадаўцаў і працоўных грамадзян — 98,3 %. Расходы бюджэту фонду разлічаны ў суме 38 495,4 мільёна рублёў, або 117,3 % да бюджэту фонду за 2025 год. Асноўную суму расходаў (гэта 80,7 %) прадугледжваецца накіраваць на фінансаванне пенсіённага забеспячэння.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Святлана БАРТАШ** падкрэсліла: «Матэрыяльная дапамога непрацаздольным асобам, якія маюць патрэбу, уключаючы аказанне паслуг па іх выплаце, фінансаванне санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення, спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў прафсаюзаў, а таксама аплаты аднаго дадатковага вольнага ад працы дня ў месяц маці (мачасе) або бацьку (айчыму), апекуну (папячыцелю), якая (які) выхоўвае дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, — гэта тыя кірункі выкарыстання бюджэту фонду, якія ўжо склаліся».

***У першым чытанні быў прыняты законапраект «Аб змяненні законаў» (па пытаннях падатковых праваадносін).*** Так, падатковая палітыка ў 2026 годзе будзе накіравана на забеспячэнне ўстойлівага выканання прадугледжаных бюджэтам расходных абавязацельстваў. У цэлым праект закона забяспечвае вырашэнне праблемных пытанняў падаткаабкладання з улікам вынікаў яго практычнага прымянення, далейшае спрашчэнне парадку вылічэння і выплаты канкрэтных падаткаў, аптымізацыю падатковых ільгот, удасканаленне падатковага адміністравання, а таксама палягчэнне ўспрымання плацельшчыкамі прадпісанняў Падатковага кодэкса. У рамках прапанаваных змяненняў падатковая нагрузка ў 2026 годзе прагназуецца на ўзроўні 25,7 % да ВУП.

**Член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Наталля КУЛЯШОВА** адзначыла, што дадзены праект закона — вынік сістэмнай гадавой работы кансультатыўных саветаў, рабочых груп, бізнес-супольнасцяў, якія ўнослі свае прапановы па карэкцыроўцы і змене падатковага заканадаўства: «Усе змяненні, якія сёння былі агучаны, закрануць і юрыдычныя асобы, і фізічныя. Але, у прыватнасці, яны не адаб'юцца негатыўна на фінансава-эканамічнай дзейнасці нашых суб'ектаў гаспадарання, на дабрабыце нашых грамадзян. Як звычайна, гэта базавыя велічыні, індэксацыя ставак, устаноўленых у беларускіх рублях».

***Таксама ў першым чытанні быў прыняты законапраект «Аб змяненні законаў» (па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці).***

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Дзяніс КАРАСЬ** адзначыў: «Гэты законапраект прадугледжвае карэкціроўку 4 кодэксаў і 26 законаў, якія вядуць істотны крок, для таго каб бізнес-супольнасці было камфортна і зручна працаваць у гэтым кірунку. Усе асноўныя змяненні былі прыняты папярэднім законам, які быў прыняты 1 кастрычніка 2024 года. Гэтым законапраектам прыводзяцца ў парадак заканадаўчыя акты, тэрміналогія, панцыйная структура», — рэзюмаваў парламентарый.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении аукциона по продаже незавершенного незаконсервированного жилого дома и права аренды земельного участка

**Организатор:** Стародорожский районный исполнительный комитет.

**Дата, время и место проведения аукциона**: 24 декабря 2025 г. в 12.00 по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Пролетарская, д. 38, конт. тел. (801792) 54 6 62.

Эл. адрес: jkh_otdel@staryedorogi.gov.by

| | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный в г. Старые Дороги, ул. Бородянская, 22, и земельный участок площадью 0,1489 га с кадастровым номером 625250100001000336.<br>Целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания жилого дома.<br>Не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение: готовность – 6 %, площадь застройки – 123 кв. м, фундамент – бутобетон, физический износ – 20 % |
| Инженерная инфраструктура | Асфальтовая дорога, возможность подключения к электросетям и водопроводу |
| Начальная цена | 8 150,96 рубля, в том числе начальная цена не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома – 4 592,25 рубля, начальная цена права аренды земельного участка – 3558,71 рубля |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты текущего (расчетного) банковского счета для перечисления денежных средств | 10 % от начальной цены (815,10 бел. руб.).<br>Задаток вносится перед подачей заявления на участие в аукционе на расчетный счет BY37AKBB36006290023190000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600537220, **код платежа 04805.**<br>Получатель – Стародорожский районный исполнительный комитет |
| Затраты на организацию и проведение аукциона | Расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и расходы за опубликование в печатных средствах массовой информации |

Прием заявлений и прилагаемых к ним документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 (кроме субботы и воскресенья) до 22.12.2025 включительно.

**Для участия в аукционе необходимо**:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов;
2. предоставить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельным участком, выставляемым на аукцион.

**Условия:** победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность с внесением платы в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор. Адрес ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | СООО «Эквипмент Рент Инвестмент». 220026, г. Минск, пр-т Партизанский, дом 95В, комн. 27В, литер Б 4/к |

**Предмет электронных торгов**
**Местонахождение – г. Минск, ул. Лынькова, 123**

| № лота | Наименование (модель) | Начальная цена (с НДС 20 %), руб. |
|---|---|---|
| 1 | Станок вертикально-сверлильный МН 18Н, зав. № 94, 1990 г. в. | 2 500,00 |
| 2 | Станок универсально-заточный 3Б642, зав. № 3909, 1993 г. в. | 3 000,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.12.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.12.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

# ВАЖКІ КАРАВАЙ

## У Беларусі намалацілі больш за 10,9 мільёна тон збожжа разам з рапсам і кукурузай



Паводле аператыўных звестак Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання на 24 лістапада, у краіне намалацілі 10 мільёнаў 927 тысяч тон збожжа разам з рапсам і кукурузай.

У прэс-службе ведамства растлумачылі: у Мінскай вобласці сабрана 2 мільёны 717 тысяч тон, Брэсцкай — 2 мільёны 189 тысяч, Гродзенскай — 2 мільёны 161 тысяча, Гомельскай — 1 мільён 411 тысяч, Магілёўскай — 1 мільён 372 тысячы, Віцебскай — 1 мільён 75 тысяч.

Збожжавыя і зернебабовыя культуры з кукурузай убраны з 2 мільёнаў 272 тысяч гектараў — 99 % плошчаў. Сярэдняя ўраджайнасць збожжа (з кукурузай) складае 43,7 цэнтнера з гектара, што вышэй леташняй на 5,6 цэнтнера з гектара.

Нарыхтавана 213 тысяч тон ільнотрасты ўраджайнасцю вышэй за леташнюю на 12,2 цэнтнера з гектара.

Таксама нарыхтавана 14 мільёнаў 92 тысячы тон сенажу — 101 % плана. Сіласу — 20 мільёнаў 57 тысяч тон — 97 %. Травяных кармоў — 9 мільёнаў 771 тысяча тон кармавых адзінак — больш за 97 %.

Цукровыя буракі ўбраны з больш чым 108 тысяч гектараў — 100 % плошчаў. Накапана 5 мільёнаў 937 тысяч тон караняплода. Ураджайнасць вышэйшая за леташнюю на 53 цэнтнеры з гектара. На буракапрыёмныя пункты вывезена 5 мільёнаў 8 тысяч тон — 84 % ад накапаных буракоў.

Падняні 1 мільён 299 тысяч гектараў зябліва — 91 % ад плана ў 1 мільён 432 тысячы гектараў.

# АКТЫЎНАСЦЬ СТЫМУЛЮЕ РАЗВІЦЦЁ

## У ЕАБР патлумачылі прычыну росту ВУП Беларусі

ВУП нашай краіны вырас на 1,5 % у студзені – кастрычніку 2025 года. На гэта звяртаюць увагу аналітыкі ў штотыднёвым макрааглядзе Еўразійскага банка развіцця.

— Спажывецкая і інвестыцыйная актыўнасць працягвае падтрымліваць пашырэнне эканомікі, — акцэнтавалі аналітыкі банка. — Рознічны тавараабарот павялічыўся на 7,7 % года да года. Пашырэнне інвестыцый у асноўны капітал склала 13,2 % года да года. Выпуск у сельскай гаспадарцы аднавіўся да ўзроўню студзеня – кастрычніка 2024 года.

У ЕАБР звярнулі ўвагу на той факт, што вытворчасць у прамысловасці ва ўмовах астуджэння попыту з боку Расіі працягвае зніжацца.

— Дзякуючы павышанаму ўнутранаму попыту чакаем больш высокіх тэмпаў росту па выніках 2025 года, — спрагназавалі аналітыкі.




# БЕЗ РЫЗЫК І ПАГРОЗ

## У краіне стартаваў «Тыдзень кібербяспекі»

Галоўная мэта ініцыятывы, якая праходзіць з 24 па 30 лістапада — дапамагчы кожнаму жыхару краіны адчуваць сябе больш упэўнена ў лічбавай прасторы: даведвацца аб новых схемах махлярства, фарміраваць звычку бяспечных паводзін у сетцы, умацоўваць культуру адказнага выкарыстання тэхналогій.



Дарэчы, у 2025 годзе намецілася пазітыўная тэндэнцыя: па выніках дзесяці месяцаў колькасць такіх правапарушэнняў зменшылася на 9 % — гэта важны крок да больш абароненай лічбавай будучыні.

У рамках акцыі асаблівая ўвага будзе ўдзелена супрацьдзеянню тэлефоннаму і анлайн-махлярству, а таксама прафілактыцы ўключэння грамадзян, асабліва моладзі, у незаконныя схемы па атрыманні наяўных грашовых сродкаў. Асобны акцэнт будзе зроблены на абарону найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва — пенсіянераў і непаўналетніх.

Арганізатары звярнулі ўвагу на галоўнае: бяспечны інтэрнэт пачынаецца з кожнага з нас.

# УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

## Беларуская дэлегацыя прадставіла ў сталіцы Нігера прамысловы патэнцыял краіны

Рабочы візіт дэлегацыі прадстаўнікоў прадпрыемстваў сістэмы Міністэрства прамысловасці Беларусі на чале з намеснікам міністра прамысловасці Дзянісам Бакеем адбыўся ў Нігер на мінулым тыдні. Пра вынікі паездкі расказалі ў профільным ведамстве.

У прыватнасці, у першы дзень візіту беларускую дэлегацыю прыняў мэр сталіцы Нігера — Ніямей — Бубакар Гаранке. Бакі ўзгаднілі і падрыхтавалі да падпісання Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Міністэрствам прамысловасці Беларусі і муніцыпалітэтам Ніямея, які прадугледжвае стварэнне сумеснай рабочай групы па пытаннях пастаўкі ў нігерыйскую сталіцу пасажырскага транспарту і камунальнай тэхнікі вытворчасці МАЗ.

Пытанні актывізацыі адукацыйнага абмену і падрыхтоўкі кадраў для сэрвісна-тэхнічных цэнтраў абмяркоўваліся на сустрэчы з міністрам адукацыі і прафесійна-тэхнічнага навучання Мумуні Фарма.

Таксама адбылася сустрэча беларускай дэлегацыі з прэм'ер-міністрам Нігера Амінам Зейнам, падчас якой абмяркоўваліся пытанні нарошчвання ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Акрамя таго, беларуская дэлегацыя правяла перагаворы з міністрам энергетыкі Нігера Амаду Хаўа, у ходзе чаго пацвердзілася запатрабаванасць беларускіх трансфарматараў у праектах па электрыфікацыі краіны. Выказана таксама зацікаўленасць кар'ернай тэхнікай вытворчасці БЕЛАЗ, якая можа быць выкарыстана ў кар'ерах па здабычы вугалю.

У ходзе сустрэчы ў гандлёва-прамысловай палаце Ніямея беларуская дэлегацыя дэталёва азнаёмілася з умовамі вядзення бізнесу ў краіне і наяўнымі праграмамі развіцця розных галін эканомікі.

На перагаворах з генеральным сакратаром Міністэрства сельскай гаспадаркі і жывёлагадоўлі Абду Усмане бакі дэталёва абмеркавалі праграму ірыгацыі зямель з мэтай іх увядзення ў гаспадарчы абарот, а таксама пытанні механізацыі сельскай гаспадаркі. Падрабязна праінфармавалі аб перавагах сельскагаспадарчай тэхнікі МТЗ і адпаведнага навяснога абсталявання беларускіх вытворцаў.

Раней дэлегацыя прадпрыемстваў галіны (МАЗ, МТЗ, БЕЛАЗ, МЭТЗ імя Казлова), а таксама партнёрскай кампаніі Quantum Dynamics ужо наведалі Рэспубліку Малі і Буркіна-Фасо.

# ЗНАК ЯКАСЦІ БЕЛАРУСКАГА БІЗНЕСУ

## Назвалі пераможцаў Нацыянальнага конкурсу «Прадпрымальнік года»

Днямі прайшла штогадовая ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Нацыянальнага конкурсу «Прадпрымальнік года», якая стала фінальным мерапрыемствам Беларускага тыдня прадпрымальніцтва. Па выніках работы ў 2024 годзе лаўрэатамі конкурсу сталі 33 прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу — ініцыятыўныя беларусы, чые ідэі і праца трансфармаваліся ў паспяховыя справы ў розных галінах рэальнага сектара: ад прамысловасці і транспарту да сферы паслуг і турызму.

— Усе прадпрыемствы, індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, робяць адпаведны ўнёсак у сваю галіну. Напрыклад, толькі ад пераможцаў у бюджэт паступіла каля 70 мільёнаў рублёў, а гэта супастаўна з будаўніцтвам трох дзіцячых садкоў. Здавалася б,




33 прадпрыемствы, але які ўклад у эканоміку краіны! — адзначыў на цырымоніі ўзнагароджання **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР**.

Ён таксама звярнуў увагу, што лаўрэаты конкурсу забяспечваюць занятасць больш за 2,6 тысячы чалавек, толькі сёлета імі створана больш як 140 рабочых месцаў. А такіх прадпрыемстваў з ліку малога і сярэдняга бізнесу ў нас у краіне больш за 130 тысяч.

Сёння суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ствараюць больш за чвэрць валавога ўнутранага прадукту краіны, кожны трэці рубель у даход бюджэту паступае ад МСП. Яны забяспечваюць пятую частку аб'ёму прамысловай вытворчасці, трэцюю частку ў рознічным таваразвароце. Акрамя таго, МСП адыгрывае важную ролю ў знешнім гандлі.

Безумоўна, галоўнымі складнікамі поспеху з'яўляюцца ініцыятыўнасць, працавітасць і ўпартасць прадпрымальнікаў, якія разам з фінансавай падтрымкай прыносяць значныя і эфектыўныя вынікі.

Віншуючы пераможцаў конкурсу ў намінацыі «Стабільны поспех», **першы намеснік старшыні праўлення Банка развіцця Раман БРОДАЎ** (які ўчора Указам Прэзідэнта быў прызначаны членам Савета Рэспублікі) адзначыў, што падтрымка фінансавага інстытута штогод накіроўваецца на амаль тысячу невялікіх вытворчасцяў у кожным раёне краіны.

— У бягучых сусветных рэаліях стабільнасць — значна больш, чым азначала гэта слова яшчэ некалькі гадоў таму. Банку развіцця асабліва прыемна ўручаць сёння заслужаныя ўзнагароды ў намінацыі, дзе галоўным з'яўляецца менавіта слова «стабільны». Удвая прыемна, што палова прызёраў — кліенты Банка развіцця. Ваш паспяховы вопыт наглядна дэманструе, як дзяржаўныя інструменты падтрымкі працуюць на ўмацаванне эканамічнага суверэнітэту краіны, — падкрэсліў Раман Бродаў.

# ВЫГАДНЫЯ ПРАПАНОВЫ

## Ганконгская дзелавая місія наведала індустрыяльны парк «Вялікі камень»

Днямі «Вялікі камень» наведаў кіраўнік Асацыяцыі «Дзелавы Альянс Усходняй Еўропы» (GEEBA) сумесна з кампаніямі Ганконга і рэгіёна вялікага заліва, зацікаўленымі ў развіцці прамысловага, інвестыцыйнага і гандлёвага супрацоўніцтва з нашай краінай, паведамілі ў адміністрацыі парка.

Гасцей азнаёмілі з гісторыяй стварэння парка, ільготнай палітыкай «Вялікага каменя», а таксама асноўнымі сферамі дзейнасці рэзідэнтаў і ўзорамі выпускаемай прадукцыі. У ходзе візіту бізнес-місія таксама наведала вытворчыя плошчы рэзідэнтаў парка ў сферы машынабудавання, электронікі і тэлекамунікацый, дзе гасцям былі прадстаўлены асаблівасці тэхналагічных працэсаў.

Падчас перагавораў бакі абмеркавалі перспектывы рэалізацыі і развіцця інвестыцыйных праектаў на тэрыторыі «Вялікага каменя». Была адзначана важнасць развіцця двухбаковых адносін, у тым ліку ў сферы вытворчасці кампанентаў, у рамках развіцця кластараў машынабудавання, электронікі і тэлекамунікацый. Госці высока ацанілі прэферэнцыйную палітыку, інфраструктурнае абсталяванне парка. Была адзначана гатоўнасць выкарыстання пляцоўкі «Вялікага каменя» для рэалізацыі інавацыйных вытворчасцяў, а таксама выставачных мерапрыемстваў асацыяцыі.

Па завяршэнні візіту прадстаўнікі ганконгскіх кампаній Lonco Company Limited і LK Group правялі сустрэчу з дзеючым рэзідэнтам парка ТАА «Хьюман Крафт», дзе абмеркавалі спецыфіку арганізацыі вытворчасці прадукцыі, асаблівасці лагістычнага працэсу, а таксама вектары далейшага супрацоўніцтва.

# СПРАВА ТЭХНІКІ

## На Мінскім аўтамабільным заводзе разгледзяць удзел у некалькіх камерцыйных праектах з патэнцыяльнымі партнёрамі з Казахстана

Пра гэта паведамілі на прадпрыемстве па выніках удзелу прадпрыемства ў міжнароднай транспартнай выстаўцы ў Астане.

— МАЗ сумесна з афіцыйным дыстрыб'ютарам «Гандлёвы дом «МАЗ-Казахстан» і дылерам «МАЗ цэнтр Казахстан» удзельнічалі ў XXI Міжнароднай выстаўцы Kaztraffic у Астане, прысвечанай транспартнай інфраструктуры і дарожнаму будаўніцтву, — паведамілі ў прэс-службе аўтамабільнага флагмана. — У ходзе работы экспазіцыі быў праведзены шэраг сустрэч і перагавораў з удзелам прадстаўнікоў Казахстанскай дзелавой супольнасці, дасягнуты дамоўленасці аб прапрацоўцы шэрагу камерцыйных праектаў.

З экспазіцыяй тэхнікі МАЗ таксама азнаёміўся Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Казахстан Аляксей Багданаў, дадалі на заводзе.

XXI Міжнародная выстаўка Kaztraffic-2025 праходзіла з 19 да 21 лістапада ў Міжнародным выставачным цэнтры EXPO ў Астане пры падтрымцы Міністэрства транспарту Рэспублікі Казахстан. Гэта адна з найбуйнейшых і найбольш аўтарытэтных галіновых падзей, прысвечаных развіццю дарожнага будаўніцтва і інфраструктуры. Сёлета ў выстаўцы ўдзельнічала больш за 300 кампаній.




# ИЗМЕНЕНИЯ В ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект»,

опубликованную в газете «Звязда» от 26.02.2021 г.
по объекту: «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр-т Жукова в г. Минске» 3-я очередь строительства 3-7-я секции

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «Ника-Проект», зарегистрированное в ЕГР 22.03.2011 за № 191581623.

Местонахождение: г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 155, оф. 810, тел. +375 29 647 70 00.

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 84,60 кв. м, расположенного в 6-й секции на 3-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр-та Жукова с уровня земли и встроенного нежилого помещения общей площадью 91,0 кв. м, расположенного в 7-й секции на том же этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр. Жукова с уровня земли.

Высота помещений составляет 2,85 метра. Встроенные помещения изолированы от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяется навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются помещения общественного назначения по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1637,32 доллара США.**

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 46,0 кв. м, расположенного в 6-й секции на 3-м нежилом этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр-та Жукова с уровня земли и встроенного нежилого помещения общей площадью 44,70 кв. м, расположенного в 7-й секции на том же этаже, с обособленным входом непосредственно с улицы со стороны пр-та Жукова с уровня земли.

Высота помещений составляет 2,85 метра. Встроенные помещения изолированы от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяется навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются помещения общественного назначения по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1637,32 доллара США.**

Встроенные помещения передаются с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенных помещений выполняется отдельно от системы отопления жилого дома с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенных помещений – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенных помещений – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитазов.

Электроснабжение: предусмотрена установка вводно-распределительных щитков. От каждого вводно-распределительного щитка предусмотрено подключение оптического модема, системы вентиляции, щитка пожарной сигнализации, дополнительно предусмотрен резерв.

Общая суммарная выделенная электрическая мощность на помещения общественного назначения составляет 220 кВт. Проектом предусмотрена техническая возможность подключения потребителей 5-20 кВт в зависимости от площади помещения и его функционального назначения. Связь и сигнализация: установка оптического распределительного устройства для предоставления услуг связи РУП «Белтелеком». Встроенные помещения оборудуются автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения с выводом на пульт диспетчеризации МЧС. По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Условия оплаты:**

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости объекта либо иные условия его оплаты



# Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении электронных торгов

| Предмет торгов | Начальная цена, руб. (без НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** легковой седан VOLKSWAGEN PASSAT, год выпуска 2012 г., регистрационный знак 3888 II-1, кузов № WVWZZZ3CZCP061341 | 21 377,18 | 2 137,72 |

**Местонахождение объекта торгов:** г. Брест, ул. В. Хоружей, 8.
**Продавец:** Экономический суд Брестской области, 224030, г. Брест, ул. В. Хоружей, 8, тел./факс 80162204065.

Электронные торги состоятся 30 декабря 2025 г. в 11.00.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG».

**Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс: 80162 40 87 01, 40 87 41, brest@ino.by

**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 201028245

# РАСПРАЎЦЕ КРЫЛЫ І — НАПЕРАД!



У віншаванні работнікам грамадзянскай авіяцыі з прафесійным святам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка надаў падзеі асаблівае значэнне: «У гэтым навучальным годзе ўпершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі адбудзецца выпуск пілотаў грамадзянскай авіяцыі, што дазволіць умацаваць кадравы і тэхналагічны суверэнітэт краіны», — сказаў ён. І вось гэта гістарычная падзея адбылася.









... У парадпай лётнай форме, сабраныя і сур'ёзныя, выпускнікі ўжо выглядалі як сапраўдныя пілоты і думалі як сапраўдныя пілоты. Зорачка акадэміі, як яе называюць у ВНУ выкладчыкі, разумніца і прыгажуня **Яна ПАСІНІЦКАЯ — адзіная дзяўчына ў выпуску**. Як мы даведаліся, у свой час яна выбірала паміж дзвюма, зусім непадобнымі спецыяльнасцямі — эканаміст або пілот.



— Што я выбрала, вы ўжо ведаеце, — усміхаецца дзяўчына. — І я выразна разумела, на што ішла і чым буду займацца. Вядома, спачатку было цяжка, асабліва калі вывучалі авіяцыйны рухавік — я ж дзяўчынка. Але дапамагалі разбірацца выкладчыкі і аднагрупнікі, веды засвойваліся, прыходзіла разуменне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*







Яна на ўсё жыццё запомніла свой першы палёт.

— Гэта было незабыўна, — дзеліцца будучы пілот. — Пасля першай лётнай практыкі прыйшло вялікае жаданне лятаць, навучальны год доўжыўся так доўга ... Мы ўсе чакалі лета, каб ужо выйсці на лётную практыку і хутчэй лятаць!

Зусім хутка мара выпускніцы БДАА ажыццявіцца — дзяўчына папоўніць лётны атрад «Белавія».

Як расказаў **рэктар Акадэміі авіяцыі Ігар ЯЦКЕВІЧ**, акрамя падрыхтоўкі інжынераў і пілотаў установа адукацыі праводзіць навучанне цэлага шэрагу авіяцыйных спецыялістаў. Тут атрымліваюць сярэднюю і вышэйшую адукацыю, вучацца ў магістратуры, аспірантуры і на курсах павышэння кваліфікацыі. На факультэтах грамадзянскай і ваеннай авіяцыі вучаць па шасці спецыяльнасцях і 11 прафілізацыях. У аддзяленні сярэдняй спецыяльнай адукацыі навучанне вядзецца па шасці спецыяльнасцях, а ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі праходзяць падрыхтоўку работнікі авіяцыйных арганізацый.

У акадэміі сёння вучыцца больш за 1,5 тысячы курсантаў: будучыя пілоты, дыспетчары, інжынеры па эксплуатацыі паветраных суднаў, рухавікоў, бартавога абсталявання, беспілотнікаў, а таксама спецыялісты па іншых кірунках. Аднак вернемся да таго, чаму і як вучаць па спецыяльнасці «Лётная эксплуатацыя паветраных суднаў грамадзянскай авіяцыі» (кваліфікацыя «Іжынер. Пілот»).

Выкладчыкі расказалі, што ў працэсе навучання курсанты праходзяць тэарэтычную, трэнажорную і лётную падрыхтоўку. Як сёння прынята ва ўсіх ВНУ і ССНУ, упор робіцца на практыка-арыентаванасць — набыццё практычных уменняў і навыкаў. У лётнай справе гэта асабліва важна.

— Практыку курсанты першага набору праходзілі на базе Мінскага аэраклуба ДТСААФ, — спыніліся на падрабязнасцях спецыялісты ВНУ. — Кожны павінен быў налятаць 150 гадзін на звышлёгкім Viper CD і двухматорным Tecnam P2006T. Да гэтага курсанты трэніраваліся на сімулятарах, якія імітуюць кабіну рэальнага самалёта, з месцамі для курсанта і інструктара.

Члены камісіі адзначылі высокі ўзровень ведаў і падрыхтоўкі курсантаў-выпускнікоў. Па выніках дзяржэкзамену сямёра з іх атрымалі 9 балаў, ёсць і 10-бальнікі.



**Сяргей МАРОЗАЎ, намеснік дырэктара арганізацыі лётнай работы авіякампаніі «Трансавіяэкспарт»**, — легенда нашай грамадзянскай авіяцыі. Доўгія гады ён кіраваў цяжкавагавымі грузавымі лайнерамі, быў камандзірам авіяцыйнага атрада. Сёння ён не толькі член камісіі, які ацэньвае веды курсантаў. Ён, па сутнасці, прымае ў калектыў новага члена каманды — выпускніка Максіма Русецкага. Пасля атрымання дыплома юнак таксама будзе кіраваць паветранымі «цяжкавагавікамі».

— У нашай кампаніі адразу ідзе перавучванне, — расказвае Сяргей Марозаў. — Але, думаю, цяжкасцяў не будзе — у Акадэміі курсанты праходзяць вельмі грунтоўнае навучанне. Акрамя таго, у нас з імі былі дадатковыя заняткі яшчэ да выпуску, спецыялісты «Трансавіяэкспарта» прымалі ўдзел у складанні розных праграм, праводзілі кансультацыі. А што да адаптацыі Максіма ў нашым калектыве, то яго чакае самы цёплы прыём, дапамога, падтрымка. Па-іншаму ў лётчыкаў не бывае.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

НА СВАЕ ВОЧЫ

# РАМОНТ УЗЛЁТНАЙ ПАЛАСЫ ПАЧАЎСЯ

## Якія змены чакаюць Гродзенскі аэрапорт

Беларусь была і застаецца адкрытай краінай ва ўсіх сэнсах, нягледзячы на тое, што цяперашняя сітуацыя ў свеце значна паўплывала на ўсе сферы жыцця, у тым ліку і на турыстычныя патокі ды паветраныя зносіны. Уласны карэспандэнт «Звязды» адправілася ў Гродзенскі аэрапорт, каб даведацца, як ён працуе ў сучасных умовах.















У жыцці Гродзенскага аэрапорта пачаўся новы этап. На пасаду **начальніка ў жніўні прыйшоў Сяргей РУРЫС**, які да гэтага працаваў у Віцебскім аэрапорце. Суразмоўца адзначае, што планаў шмат, але далёка не пра ўсе хочацца казаць — пакуль рана. Цяпер актыўна вядуцца работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі аэрапорта. А самыя маштабныя — планавы рамонт узлётна-пасадачнай паласы, які, дарэчы, пачаўся.

— Гродзенскі аэрапорт допушчаны да забеспячэння міжнародных палётаў з 1993 года, аэрадром аднасіцца да класа «В». Ён мае ўсе неабходныя для гэтага службы: мытны, пагранічны і санітарны кантроль. У 2025 годзе прайшоў сертыфікацыю на прыдатнасць да ажыццяўлення аэрапартавай дзейнасці, і пачатак рамонтных работ не азначае, што паласой нельга было карыстацца да гэтага. Яна сертыфікавана і допушчана да эксплуатацыі. Рамонтныя работы дазволяць павысіць якасць пакрыцця і зробяць паласу больш сучаснай.

## КАРТА НАДВОР'Я

Нягледзячы на тое, што загружанасць аэрапорта на сёння невялікая, ён у любы час дня і ночы гатовы прымаць самалёты. А яшчэ цікавым аказалася тое, што аэрапорт падобны на маленькую дзяржаву. Тут ёсць свая ахова і супрацьпажарныя падраздзяленні, спецыялісты, якія займаюцца запраўкай паветраных суднаў. Акрамя таго, ёсць служба эксплуатацыі радыётэхнічнага забеспячэння сувязі. Нават ацяпляецца будынак ад уласнай кацельні. Ёсць і метэаралагічная служба. Як расказала **інжынер-сіноптык Дар'я РАТАМСКАЯ**, у аэрапортах па ўсім свеце метэаралагічная служба адыгрывае важную ролю ў забеспячэнні бяспекі палётаў. Спецыялісты складаюць прагнозы для пасадкі і вылету самалётаў, праводзяць кансультацыі для экіпажаў і адсочваюць змены надвор'я.



— Мы назіраем за бачнасцю, воблачнасцю, тэмпературай, кропкай расы, туманам і іншымі метэаралагічнымі з'явамі. Гэтыя даныя наносяцца на спецыяльныя карты, якія выкарыстоўваюцца для прагназавання надвор'я. У нас ёсць і ўласныя прыборы для вымярэння бачнасці і іншых параметраў. Зразумела, што ўмовы надвор'я могуць істотна паўплываць на палёты. Таму метэаролагі выпускаюць дадатковыя зводкі ў выпадку змяненняў. І гэтая работа вядзецца кругласутачна і ніколі не спыняецца, — расказала спецыяліст.

Таксама ўдалося паразмаўляць з **вядучым інжынерам службы па эксплуатацыі наземных збудаванняў Дзмітрыем ЛЯШЧЫНСКІМ**. Адна з яго задач — кантроль за станам узлётна-пасадачнай паласы. Раніцай ён выязджае на месца, каб агледзець усе элементы лётнага поля.

— Асабліва важна сачыць за станам паласы зімой, калі ідзе снег. Трэба кантраляваць колькасць, яго тып (сухі, мокры) і шчыльнасць. У гэтай справе дробязяў не бывае, важна ўсё, — адзначыў спецыяліст.

## КААРДЫНАЦЫЯ І КАНТРОЛЬ

Сяджу высока, гляджу далёка. Не, я не забылася, што пішу не казку. Проста гэта першае, што прыйшло ў галаву, калі апынулася на назіральнай вышцы. Выгляд адкрываецца проста неверагодны, нават нягледзячы на тое, што ў дзень візіту стаяла пахмурнае надвор'е. Але ўвогуле месца гэта прызначана не для любавання прыгажосцю. Тут размяшчаецца камандна-дыспетчарскі пункт, які каардынуе работу ўсяго аэрапорта. Кіруе працэсам **кіраўнік палётаў службы паветранага руху Васіль ПАПОЎ**, які прыйшоў у Гродзенскі аэрапорт па размеркаванні ў 2012 годзе. Ён адзначыў, што дзень нараджэння ў яго — у Міжнародны дзень авіядыспетчара, таму і абраў гэтую прафесію. Вядома, да канца не зразумела, наколькі гэта жарт, а наколькі праўда, але факт цікавы.



— Адказваю за арганізацыю і кантроль працы дзяжурнай змены. Кожную раніцу праводжу інструктаж для супрацоўнікаў змены і кантралюю праходжанне імі медыцынскага агляду. На працягу працоўнага дня забяспечваю дакладнае ўзаемадзеянне паміж усімі службамі. На нашым працоўным месцы — сучаснае абсталяванне, у тым ліку шматфункцыянальныя панэлі для сувязі з экіпажамі і кіравання светлавымі прыборамі. Нядаўна атрымалі новую аўтаматызаваную сістэму кіравання паветраным рухам, якая ўжо прайшла абкатку і адпавядае ўсім неабходным патрабаванням, — расказаў кіраўнік палётаў.



## У ЧАКАННІ ПАЛЁТАЎ

Сяргей Рурыс паведаміў, што раней вялікай папулярнасцю карысталіся рэйсы з Гродна ў Калінінград і назад. Наўпрост гэта каля 200 кіламетраў, і час палёту не займаў больш за 45 хвілін. А цяпер з-за абмежавання на палёты шлях можа заняць больш чым 3 гадзіны. На гэты момант Гродзенскі аэрапорт у асноўным прымае невялікія прыватныя судны.

— Але, вядома, стаіць задача наладзіць рэгулярныя вылеты. Цяпер актыўна ідуць перагаворы з авіякампаніямі з Расіі. Мы гатовы ў любы час прымаць паветраныя судны. Для гэтага ў аэрапорце ёсць усё: штат прафесіяналаў, матэрыяльна-тэхнічная база. За гадзіну можам прымаць да 300 пасажыраў. Ёсць планы на пашырэнне зоны чакання. Зразумела, хацелася б наладзіць зносіны і па турыстычных напрамках. Вядзём перагаворы з турфірмамі, цесна супрацоўнічаем з упраўленнем спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама. Стаіць задача да лета вырашыць гэтае пытанне.

Таксама суразмоўца выказвае надзею на тое, што ў хуткім часе зменіцца закінуты будынак, які знаходзіцца па суседстве з аэрапортам, — не так даўно з'явіліся інвестары, якія плануюць адкрыць тут лагістычны цэнтр. Работы пакуль не пачаліся, але ўсе зацікаўленыя бакі спадзяюцца, што ў хуткім часе праект увасобіцца ў жыццё.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,**
**фота аўтара.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)*, по поручению **ОАО «Белслучь»** *(Продавец)*, проводит открытый аукцион по продаже

**склада запасных частей**

**с инв. № 644/С-63609 общ. пл. 240,5 кв. м, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 625080800001000018 (право аренды по 25.04.2073) площадью 0,1901 га, по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, Долговский с/с, 2А, р-н д. Желтый Брод.**

Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильных дорог (0,1901 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **35 904,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 590,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 20 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **08.12.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.12.2025** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320. **Тел.: (8017) 516-80-64, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: (8029) 102-93-24.**

УНП 600071222

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

| **Извещение о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона** | | |
|---|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | |
| **Продавец** | ЗАО «ФК «ДИНАМО-МИНСК», 220030, г. Минск, ул. Кирова, д. 8, корпус 6, пом. 33 (5-ый этаж) | |
| **Предмет публичных торгов (электронного аукциона)** | | |
| Лот № | Наименование | Начальная цена, с учетом НДС 20 %, бел. руб. |
| 1 | Автобус HIGER, синий, 2012 года выпуска, модификации KLQ6125B, бывший в употреблении | 103 064,29 |
| **Задаток:** 3 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций».** **Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота | | |
| Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by | | |
| **Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций»,** размещенным по адресам: https://iintorgi.by | | |
| Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона) | | |
| **Дата и время проведения торгов (аукциона):** 29.12.2025, начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 25.11.2025 с 09.00 по 24.12.2025 г. до 15.00. Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов | | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.** | |

Уважаемые акционеры
ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»!

**15 декабря 2025 года в 15.00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»**
по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (актовый зал).

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:

1. О внесении изменений в Устав ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
2. О внесении изменений в Положение о наблюдательном совете открытого акционерного общества «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ».
3. О досрочном прекращении полномочий членов ревизионной комиссии Общества.
4. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
5. О вознаграждении членов наблюдательного совета.

Реестр акционеров для участия в собрании акционеров будет сформирован по состоянию на 1 декабря 2025 г.

С материалами по вопросам повестки для собрания лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 в следующем порядке:

- с 08.12.2025 по 12.12.2025 в рабочие дни с 9.00 до 16.45 по месту нахождения Общества;
- в день проведения собрания 15.12.2025 – с 9.00 до 14.00 по месту его проведения – с материалами по вопросам повестки дня собрания акционеров.

Регистрация участников собрания будет осуществляться 15 декабря 2025г. с 14.15 до 14.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации акционеру Общества при себе иметь – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
ОАО «МИНСКИЙ ДОМОСТРОИТЕЛЬНЫЙ КОМБИНАТ»

УНП 100258980



ЧАЛАВЕК ПРАЦЫ

# ПРАФЕСІЯ Ў СПАДЧЫНУ

## Як у Асіповіцкім раёне перадаюцца вопыт і любоў да справы

Дынастыямі ганарацца. Калі яны ёсць на прадпрыемстве, значыць, яно ўстойлівае, надзейнае, стабільна развіваецца. У Асіповіцкім раёне мы сустрэліся з прадстаўнікамі некалькіх дынастый. Што стала матывацыяй для некалькіх пакаленняў трымацца за адно і тое ж месца працы, даведаліся з першых вуснаў.

### ДОСВЕД І ПАРАДА

У сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Вязаўніца АГРА», цэнтральная сядзіба якога знаходзіцца ў аграгарадку Вязаўніца, працуюць трактарыстамі Уладзімір Стрыкуноў і яго сын Дзмітрый. Летам разам шчыравалі на ўборачнай, восенню таксама спраў хапае.

— У сельскую гаспадарку прыйшоў невыпадкова, — расказвае старэйшы Уладзімір. — Стрыечны дзядуля па мацярынскай лініі быў старшынёй калгаса і пераманіў нас сюды з Магілёўскага раёна. У гаспадарцы, лічы, з 14 гадоў. Пачынаў слесарам, потым услед за бацькам перакваліфікаваўся ў трактарысты. З часам навучыўся разумець тэхніку і яе рамантаваць.

Дзмітрый — старэйшы сын у сям'і. Магчымасць разам з бацькам пакатацца на трактары была з маленства. У якасці памочніка камбайнера ўпершыню паспрабаваў сябе ў 16 гадоў, а пасля заканчэння Клічаўскага аграрна-тэхнічнага каледжа, дзе атрымаў спецыяльнасць тэхніка-механіка, асэнсавана прыйшоў працаваць у калгас.

— Калі нешта не атрымліваецца па рамонце трактара, заўсёды звяртаюся да бацькі, — кажа Дзмітрый. — Ён заўсёды дасць добрую параду і нагадае, што ў гэтай справе не павінна быць спешкі. Я шмат разоў у гэтым пераконваўся.

Работы ў гаспадарцы заўсёды шмат, але Дзмітрый прагорад не марыць. Спрабаваў жыць у Асіповічах, але не спадабалася. Цікавасць да тэхнікі малады чалавек атрымаў у спадчыну. Нават у сацыяльных сетках тонкасці абмяркоўвае. Далучыўся да групы «Мотаблочнікі браты». «Там уся Беларусь — і Магілёў, і Гомель, і Бабруйск, — кажа суразмоўца. — Часам карысныя рэчы расказваюць. Пра рухавікі, каробкі перадач».

Акрамя таго, што прафесія ў бацькі з сынам адна на дваіх, яны яшчэ і падтрымліваюць адзін аднаго. «Важна, што родны чалавек побач», — кажа Уладзімір.



Уладзімір і Дзмітрый СТРЫКУНОВЫ працуюць у калгасе трактарыстамі.

— Дынастыі — гэта добра, старэйшыя перадаюць вопыт малодшым, дапамагаюць, — кажа **выконваючы абавязкі кіраўніка гаспадаркі Юрый СЫЧЭВІЧ**.

### ДЗЕ НАРАДЗІЎСЯ, ТАМ І СПАТРЭБІЎСЯ

У ААТ «ЖорнаўкаАГРА» Юлія Доўнар прыйшла працаваць інспектарам па кадрах пасля заканчэння Мар'інагорскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Муж родам з Асіповіч, але ўслед за жонкай пераехаў у Жорнаўку.

У гаспадарцы працуюць бацькі Юліі — Сяргей і Лідзія Раманенкі, тата — у будаўнічай брыгадзе падсобным рабочым, маці — бухгалтарам-касірам. А яшчэ — цётка Рэгіна і стрыечная сястра Алена Хвішчук. У 1970-я тут працавалі дзядуля Алены — Мікалай Хвішчук, потым — яго сын і дачка. За імі прыйшлі зяць і ўнучкі.

— У горадзе ніколі не хацелася застацца, — кажа Юлія.— Тут радзіма, паветра чыстае. Нам з мужам і дзецьмі нясумна. У вольны час любім падарожнічаць. Садзімся ў машыну і едзем куды душа пажадае. Былі і ў Брэсце, і ў Гродна.

Маці Юліі Лідзія Мікалаеўна прызнаецца, што ў яе ў маладосці таксама была магчымасць застацца ў горадзе, але яна не рызыкнула ехаць далёка ад бацькоў, вывучылася на бухгалтара і вярнулася ў вёску.

Стрыечная сястра Алена Хвішчук працуе аграномам, падчас водпуску падмяняе дырэктара. Гаспадарка вялікая: два малочна-таварных комплексы, вялікія палеткі — працы шмат. Але ёй падабаецца гэты рытм. Алена — спецыяліст адказны, яе неаднаразова спрабавалі пераманіць іншыя гаспадаркі, але «ЖорнаўкаАГРА» для яе родны дом. Тут пачынаў яшчэ дзед.

— Прыходзіцца дзесьці быць строгай, без гэтага не абысціся, — прызнаецца суразмоўца. — Але калі ўмець размаўляць з людзьмі, то вынік ёсць. Падабаецца, як да справы адносіцца моладзь. Нашы практыканты-мэтавікі прыходзяць нават у выхадныя і працуюць на тэхніцы. І вопыт назапашваюць, і грошы зарабляюць.

На пытанне, за што яна любіць сваю прафесію, Алена сціпла адказвае: «У сельскай гаспадарцы ні ў каго няма лёгкай працы, але мне падабаецца, што я прыношу карысць».



Дынастыя РАМАНЕНКА–ХВІШЧУК–ДОЎНАР.

### 135 ГАДОЎ СТАЖУ

Асіпаўчанка Святлана Дзмітрычэнка расказвае, што яшчэ яе бацькі па 40 гадоў прапрацавалі на Асіповіцкім заводзе аўтамабільных агрэгатаў. Маці са сваім будучым мужам пераехала з Мінска ў Асіповічы, бліжэй да бацькоў. Абодва адразу ж працаўладкаваліся на завод.

— Я прыйшла сюды ўслед за роднай сястрой у 2006 годзе, — расказвае Святлана. — Тут жа вядучым інжынерам-тэхнолагам працуе і мой муж. Калі скласці стаж усіх родных, якія працавалі на заводзе, атрымаецца 135 гадоў і 9 месяцаў.



Сям'я ДЗМІТРЫЧЭНКА працягвае працоўную заводскую дынастыю.

Прафесія бацькоў абумовіла лёс дзяцей, а цяпер яшчэ і ўнукаў. Старэйшы сын Святланы Кірыл год ужо працуе слесарам па рамонце і абслугоўванні машын, а малодшы Цімафей па мэтавым накіраванні ад завода сёлета паступіў у каледж у Мінску. Пасля яго заканчэння ўладкуецца сюды.

— На заводзе прэстыжна працаваць, — удакладняе суразмоўца. — Гэта самае вялікае прадпрыемства горада, яго калектыў складае амаль 1,5 тысячы чалавек. Робім дэталі для МАЗаў.

На думку Святланы Дзмітрычэнка, узнікненню дынастый садзейнічае жаданне бацькоў паставіць дзяцей на правераны шлях. Хочацца, каб у будучым яны мелі годную зарплату, не думалі, дзе заўтра ўзяць грошы на хлеб.

— Вяду сваіх дзяцей па тым шляху, па якім сама ішла, прыклад свой дэманструю, — кажа яна. — Тут, безумоўна, трэба працаваць, прыкласці намаганні, але ў выніку і зарплата атрымаецца годная. Работа ў нас для мужчыны карысная, уменне адрамантаваць станок дазваляе быць з тэхнікай на «ты».

У Кірыла стаж пакуль невялікі. Але машыны — гэта менавіта тое, што яго па-сапраўднаму захапляе. Цяпер вось зрабіў відэаролік пра завод для конкурсу.

— Вопыт ёсць, — усміхаецца хлопец. — Ствараю розныя відэаролікі на тэму аўтакантэнту і размяшчаю на ўсіх сацыяльных пляцоўках, у мяне 72 тысячы падпісчыкаў. Вельмі падабаецца ўсё, што звязана з машынамі. І працаваць цікава. На заводзе добры дружны калектыў. І гэта таксама вельмі важна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**
*Асіповіцкі раён.*

НА СВАЕ ВОЧЫ

# АДПАЧЫНАК НА ПРЫРОДЗЕ — СЁННЯ Ў МОДЗЕ

## Як у Гродзенскай вобласці развіваецца экатурызм




Сцежка сярод сосен, вячэра на беразе ракі, начлег у палатцы і дзясяткі кіламетраў пешшу — такі адпачынак у турыстаў з кожным годам становіцца ўсё больш папулярны, а месцы на кемпінг трэба браніраваць яшчэ ўзімку. Уласны карэспандэнт «Звязды» даведалася, як у Гродзенскай вобласці развіваецца экатурызм і што край над Нёманам можа прапанаваць гасцям. Дарэчы, я накіравалася па адной з рэкамендацый — у Ліпічанскую пушчу!

Ніхто не стане спрачацца, што Беларусь — краіна неверагоднай прыгажосці. У нас сапраўды ёсць што паглядзець, у тым ліку і ў Гродзенскай вобласці. Тут часткова размешчаны два нацыянальныя паркі — Белавежская пушча і Нарачанскі нацыянальны парк, 15 заказнікаў рэспубліканскага значэння і 28 мясцовага, 216 помнікаў прыроды. Такая разнастайнасць дае шырокія магчымасці для развіцця экалагічнага турызму. Дарэчы, больш за 10 % усёй тэрыторыі вобласці адносіцца да асабліва ахоўных прыродных тэрыторый.

Як расказаў **начальнік упраўлення спорту і турызму аблвыканкама Максім МАЛАХОЎСКІ**, у Гродзенскай вобласці актыўна падтрымліваюць развіццё экатурызму. У кожным раёне можна знайсці цікавыя аб'екты для наведвання. Напрыклад, рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Азёры», які знаходзіцца ў Гродзенскім раёне, прапануе пракаціцца па вузкакалейцы. Больш такога ў краіне няма. Гасцей чакаюць маляўнічыя краявіды і цікавая экскурсія. Запісвацца трэба загадзя, за некалькі тыдняў.

— Сёлета ў «Азёрах» з'явілася магчымасць пракаціцца на катэры па возеры Белае ў рамках новага воднага турыстычнага маршруту. Працуе візіт-цэнтр, які з'яўляецца зыходным пунктам, адкуль бяруць пачатак экалагічныя маршруты. Тут створаны пакой экалагічнай бяспекі для навучання дзяцей і дарослых правілам бяспечных і адказных паводзін на прыродзе. Цэнтр праводзіць навучальныя заняткі, семінары, арганізуе выставы. Наведвальнікі могуць запісацца на экскурсію, даведацца пра славутыя мясціны і пражыванне на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, а таксама набыць буклеты, карты і сувеніры. Акрамя таго, можна адправіцца на віртуальную экскурсію ў віяр-акулярах, — расказаў Максім Малахоўскі.

## ЛІПІЧАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ

Удасканальваюцца ўжо існуючыя экасцежкі і адкрываюцца новыя. Экамаршруты сёлета з'явіліся ў Зэльвенскім і Дзятлаўскім раёнах. Апошні пралягае на тэрыторыі Ліпічанскай пушчы. Ён уключае ў сябе 42 аб'екты і аб'ядноўвае 10 прыпыначных пунктаў. Ліпічанская пушча — вельмі цікавы аб'ект. Яна ахоплівае 3 раёны: Шчучынскі, Мастоўскі, Дзятлаўскі. І на яе тэрыторыі ў вёсцы Голубы ў хуткім часе таксама адкрыецца візіт-цэнтр з памяшканнем для часовага знаходжання турыстаў, расказаў Максім Малахоўскі.

Як расказаў **вядучы спецыяліст Рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Ліпічанская пушча» Уладзімір БАКУН,** турысты тут бываюць амаль круглы год. Вось у гэтыя выхадныя заказана экскурсія для школьнікаў. Не так даўно была вялікая група турыстаў з Ніжняга Ноўгарада. Уладзімір Бакун адзначае, што з адкрыццём візіт-цэнтра ў халодную пару года паток турыстаў можа павялічыцца. Пасля экскурсіі я зразумела, чаму людзі так цягнуцца сюды. Прыгажосць лясоў неверагодная. Прайсціся можна самастойна, гэтаму спрыяе інфраструктура: усюды ёсць паказальнікі і таблічкі, інфармацыйныя стэнды. А можна заказаць экскурсію.

— Улетку супрацоўнікі заказніка ўвесь час перамяшчаюцца па пушчы, нярэдка натыкаюся на турыстаў. Заўсёды цікава паразмаўляць, хто і адкуль. Людзі пераадольваюць вельмі вялікія адлегласці! Пакідаюць машыны і праходзяць да 20 кіламетраў паміж населенымі пунктамі, а то і болей. Але калі турысты жадаюць спыніцца на стаянцы, то пра гэта трэба паклапаціцца загадзя, бо браніраванне шчыльнае і пачынаецца адразу пасля Новага года.

Усяго на тэрыторыі заказніка размешчана 13 стаянак з альтанкамі. Усе яны знаходзяцца ў маляўнічых месцах і абсталяваны ўсім неабходным для прыемнага адпачынку. Бонус — падвоз дроў. Многія прыязджаюць адпачываць сюды ўжо на працягу многіх гадоў і паспелі абзавесціся любімымі стаянкамі. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца сплавы па Нёмане і Шчары. Дарэчы, турысты тут самых розных узростаў: ад двух да 80 гадоў. Яшчэ дзве новыя стаянкі плануюць абсталяваць паблізу дубровы. Такіх у Беларусі больш нідзе няма. На тэрыторыі 100 гектараў красуюцца магутныя дубы, якія стаяць тут ужо не адно стагоддзе. Гэта сапраўдны цуд, што яны захаваліся. Дарэчы, турысты дуброву вельмі любяць, а фатографы робяць тут здымкі неверагоднай прыгажосці.

Таксама ў Гродзенскай вобласці набірае папулярнасць такі кірунак, як ваенна-патрыятычны экатурызм. І ў Ліпічанскай пушчы такі ёсць! Акрамя ўнікальных прыродных і гістарычных аб'ектаў маршрут уключае наведванне Мемарыяла ахвярам фашызму і героям-партызанам і музея, аформленага як партызанская зямлянка. У рамках маршруту гасцей таксама знаёмяць са старой дзягцярняй, цудатворнай крыніцай, унікальнымі дрэвамі. Дарэчы, і ў іншых раёнах ёсць узоры ваенна-патрыятычнага экатурызму. Напрыклад, у Іўеўскім раёне абсталяваны цэлы комплекс зямлянак, якія ўзнаўляюць жыццё і побыт партызан, падобныя аб'екты ёсць у Налібоцкай пушчы.



## ЧАКАЕМ ГАСЦЕЙ!

